# СТАНІСЛАЎ МАНЮШКА: КАМПАЗІТАР, ДЫРЫЖОР, ПЕДАГОГ

## Творчая, педагагічная і грамадская дзейнасць знакамітага суайчынніка



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар

**Непадалёк ад Ігуменя (цяпер г. Чэрвень) у XVIII ст. знаходзіўся фальварак Убель. У розныя часы ім валодалі княжацкія роды Сапегаў, Завішаў, Агінскіх. У канцы XVIII ст. гэты маёнтак у гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Агінскага купіў багаты шляхціц Станіслаў Манюшка. У шлюбе з Евай Вайніловіч у яго нарадзілася шэсць сыноў і чатыры дачкі. Аднаму з сыноў, Чэславу, дастаўся ў спадчыну фальварак Убель. 5 мая 1819 г. там з'явіўся на свет славуты кампазітар, дырыжор, педагог Станіслаў Манюшка.**

**Паводле рашэння ЮНЕСКА мінулы 2019 год быў абвешчаны Годам Станіслава Манюшкі (1819–1872 гг.). Яго музычная творчасць з'яўляецца спадчынай трох народаў – беларускага, польскага, літоўскага. І ва ўсіх трох краінах было наладжана ўрачыстае святкаванне знамянальнай даты – 200-годдзя з дня нараджэння славутага кампазітара.**

### Вытокі музычнай вобразнасці

Сядзіба Убель размяшчалася ў маляўнічых мясцінах на рацэ Волме. Акрамя сядзібнага дома, у фальварку было шмат гаспадарчых пабудоў і невялікі парк з капліцай-пахавальняй [6, с. 244, 245]. Хараство беларускага краю і яго культура не маглі не паўплываць на светаўспрыманне хлопчыка. Асабліва яму падабаліся народныя песні. Іх падлетак слухаў з захапленнем і запамінаў. Пазней, стаўшы кампазітарам, Станіслаў Манюшка шчодра чэрпаў матывы з крыніцы народнай музыкі, выкарыстоўваў сялянскія мелодыі.



У доме Манюшкаў збіраліся літаратары, музыканты, артысты, ладзіліся музычныя вечарыны, душой якіх была маці Станіслава – Лізавета Маджарская. Яна і сама выдатна спявала, бліскуча іграла на фартэпіяна. Менавіта ад маці хлопчык атрымаў першыя ўрокі музыкі. Пазней сваю музычную адукацыю Станіслаў прадоўжыў у Мінску (у музычнай школе Д. Стафановіча), Варшаве, Берліне.

На жаль, да нашага часу сядзіба Убель не захавалася, страчаны і рэчы, звязаныя са знаходжаннем тут сям'і Манюшкі. Сёння на месцы былой сядзібы можна ўбачыць толькі фрагменты колішняга цудоўнага парку. А вось звязаная з гэтай сядзібай легенда захавалася ў сюжэце оперы «Страшны двор». У 1966 г. на месцы былога параднага ўваходу ў сядзібу Убель усталяваны абеліск.

Юнацтва і станаўленне Станіслава як прафесійнага музыканта звязана з другой фамільнай сядзібай Манюшкаў – Смілавічамі (Мінская вобласць), якая належала брату бацькі кампазітара. Палацава-паркавы комплекс, комплекс будынкаў Смілавіцкага касцёла, кляштар місіянераў прываблівалі будучага кампазітара сваёй гісторыяй, маштабам, гармоніяй. Мастацкія вобразы, народжаныя імі, увасоблены ў шэрагу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных твораў славутага кампазітара. Так, мелодыя старадаўніх курантаў Смілавіцкага замка ўплецена ў партыі Скалубы і Стэфана з оперы «Страшны двор». А ўвогуле ў операх і іншых музычных творах Станіслава Манюшкі (іх у яго каля 400) выкарыстана шмат беларускіх народных матываў, пачутых у Убелі і Смілавічах, – гэта неаднойчы адзначалі музычныя крытыкі.

Кампазітар лічыў, як і М. Глінка, што сапраўдны творца музыкі – народ, і народная творчасць стала крыніцай яго натхнення. Ён быў супраць «прыгладжвання» народных мелодый і тэкстаў, характэрнага не толькі для апрацовак, але і для зробленых у той час запісаў фальклорных твораў. Прамых фальклорных цытат у музыцы Манюшкі амаль няма. Але прасякнутыя народным духам многія са створаных ім арыгінальных мелодый з цягам часу сталі лічыцца народнымі.

Уплыў музычнага фальклору выявіўся і ў мелодыцы, і ў рытміцы твораў Манюшкі. Некаторыя крытыкі папракалі яго ў парушэнні законаў прасодыі (музычнага націску), бачылі ў гэтым аўтарскія памылкі. Аднак насамрэч гэтая асаблівасць тлумачылася ўплывам народнай песеннай творчасці. Увогуле Манюшка імкнуўся зрабіць свае творы даступнымі для выканання аматарамі музыкі. Многія яго песні, тэхнічна вельмі простыя, прызначаліся для хатняга музіцыравання, вельмі распаўсюджанага ў той час.

## Стваральнік беларускага試 опернага мастацтва

Станіслаў Манюшка цалкам абгрунтавана лічыцца родапачынальнікам беларускай нацыянальнай оперы. Ужо ў ранніх яго оперных творах «Карманьёл» і «Латарэя» выразна праявіліся тэатральныя прынцыпы (развіццё сюжэтнай лініі спектакля ў разгорнутых дыялогах, іх дамінаванне над музычнымі нумарамі). Разам з тым у операх Манюшкі, як адзначае беларуская даследчыца музычнай культуры М. Сакалоўская, «значна ўзмоцнена драматычная роля музыкі, ставяцца драматургічныя акцэнты менавіта сродкамі музычнай выразнасці (актывізацыя хору, наяўнасць шматсастаўных харавых сцэн, у якіх развіваецца сцэнічнае дзеянне, імкненне аб'яднаць музычныя нумары ў адзіную скразную кампазіцыю)». У операх на гістарычную тэму славуты кампазітар прадэманстраваў майстэрства стварэння жанравых сцэн [5, с. 47].

Але найбольш выразна тонкае разуменне законаў музычнай драматургіі выявілася ў оперы С. Манюшкі «Сялянка» («Ідылія»), створанай ім на аснове беларускага фальклорнага матэрыялу сумесна з В. Дуніным-Марцінкевічам (лібрэта). У гэтым творы па-майстэрску выкарыстаны народныя песні і танцы, паўналадна гучыць беларуская мова. Уладзіслаў Сыракомля адзначаў, што тагачасная рэчаіснасць абумовіла рашэнне стваральнікаў оперы ўвесці ў яе двухмоўе, што бытавая праўда падказала аўтару прыём перапляцення польскіх дыялогаў з крывіцкімі – адпаведна таму, хто выступае на сцэне: пан, эканом, якісь шляхціц або селянін са сваім дыялектам [9]. Менавіта ў гэтай першай беларускай оперы ўпершыню са сцэны прагучалі прымаўкі, прыказкі, крылатыя выразы беларускага народа. З'яўленне такога самабытнага твора было значнай вяхой у гісторыі нашай нацыянальнай музычнай культуры. Паводле сведчанняў тагачасных слухачоў, прэм'ера гэтай камічнай оперы ў Мінскім гарадскім тэатры (1852 г.) прайшла з незвычайным поспехам. Пасля гэтага «Сялянка» ставілася ў Бабруйску, Глуску, Нясвіжы, Слуцку. Стварэнне такой оперы было праявай творчай смеласці кампазітара, які адважыўся ва ўмовах зняважы да ўсяго беларускага адкрыта заявіць пра свае сімпатыі да беларускага народа. Гэта цалкам свядомая акцыя выразна паказала грамадзянскую і ідэйную пазіцыю Станіслава Манюшкі. І пазней тэма сацыяльнай няроўнасці, тэма свабоды былі ў ліку найважнейшых у творчасці кампазітара. Тагачасныя крытыкі неаднойчы дакаралі яго за сацыяльна завостраныя сюжэты, неаднойчы гэтыя сюжэты станавіліся падставай для прыдзірак цэнзуры, прычынай затрымкі ці забароны выдання яго твораў.

Дэмакратызм светапогляду С. Манюшкі, яго цяга да народнасці выразна праявіліся і ў аперэтах «Спаборніцтва музыкаў», «Чарадзейная вада», «Рэкруцкі яўрэйскі набор», музыка да якіх напісана на тэксты В. Дуніна-Марцінкевіча.

Сусветна вядомымі сталі такія оперы кампазітара, як «Вербум нобіле» («Слова гонару»), «Графіня», «Фліс» («Плытагоны»), «Галька». Апошняя з'явілася першай польскай нацыянальнай операй. Яна таксама адметная сваёй сацыяльнай вастрынёй і дэмакратызмам.

За 53 гады жыцця Станіслаў Манюшка напісаў звыш за 300 песень, якія склалі 12 «Хатніх спеўнікаў». Сярод аўтараў слоў, на якія напісаны гэтыя творы, – А. Адзінец, Т. Зан, А. Міцкевіч, Ул. Сыракомля, А. Ходзька, Я. Чачот. Музычны крытык В. Скарабагатаў лічыць, што кампазітар імкнуўся ўвасобіць у сваёй песеннай творчасці «нацыянальнае, краёвае, мясцовае» [4, с. 69]. Уплыў на С. Манюшку беларускіх паэтаў-рамантыкаў адзначае музыказнаўца К. Шасцілоўская: «...дзякуючы сацыяльнай завостранасці дэмакратычных вершаў Сыракомлі, узвышанай рамантычнасці трактоўкі фальклорных вобразаў Міцкевіча кампазітар спасцігнуў мастацкую сутнасць беларускага фальклору і на гэтай аснове стварыў багатую, па-мастацку каштоўную спадчыну, якая стаяла ля вытокаў беларускай музычнай класікі» [7, с. 96].

Дарэчы, у прадмове да «Хатняга спеўніка» сам кампазітар пісаў, што змясціў у ім песні

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

прынёманскага краю, дзе найярчэй праявіўся нацыянальны характар і мясцовы каларыт.

### Педагагічная дзейнасць кампазітара

Даследаванне творчасці Станіслава Манюшкі выразна сведчыць аб яго шчырай заклапочанасці станам музычнай культуры на Беларусі, невысокім узроўнем музычнай адукацыі таленавітай моладзі. Таму на працягу ўсяго жыцця кампазітар імкнуўся аказаць таленавітым маладым землякам самую дзейсную і разнастайную падтрымку. Уласным абавязкам ён палічыў стварэнне вучэбнага дапаможніка па тэорыі музыкі для аматараў.

У 1858 г. Станіслаў Манюшка пераехаў з сям'ёй у Варшаву. Нягледзячы на актыўную кампазітарскую і дырыжорскую дзейнасць (з 1858 г. і да канца жыцця ён з'яўляўся дырыжорам опернага тэатра ў Варшаве), яму ўдалося завяршыць работу над «Запіскамі па курсе гармоніі» (1871 г.). А неўзабаве свет пабачыў яшчэ адзін педагагічны твор кампазітара – «Дзённік да навукі гармоніі Станіслава Манюшкі». Абапіраючыся на класічныя еўрапейскія працы па тэорыі музыкі, аўтар паслядоўна і мэтанакіравана, ад простага да складанага, раскрыў розныя аспекты майстэрства гармоніі. Кожнае тэарэтычнае палажэнне ў дапаможніку суправаджалася нотнымі ўзорамі, прыкладамі мадуляцый і практыкаваннямі [5, с. 98].

Вядома, што С. Манюшка стварыў яшчэ адзін дапаможнік – «Школа чытання музыкі для аматараў ігры на розных інструментах, якія карыстаюцца скрыпічным і басовым ключом». Аднак па невядомых нам прычынах названая праца выдадзена не была. Музыказнаўца В. Дадзіёмава сведчыць, што рукапіс дапаможніка «... ўтрымлівае больш за 300 практыкаванняў, карысных для авалодання навыкамі ігры на фартэпіяна» [2, с. 211]. У Дзяржаўнай бібліятэцы імя М. Салтыкова-Шчадрына (Санкт-Пецярбург) захоўваецца яшчэ адна рукапісная праца кампазітара – «Заметкі аб касцёльнай музыцы». У ёй характарызуецца тагачасны стан духоўнай музыкі і выкладзены шэраг парад адносна таго, як выкарыстоўваць касцёльныя спевы ў мэтах маральнага выхавання вернікаў. Справа ў тым, што С. Манюшка з'яўляўся аўтарам шэрага музычных твораў рэлігійнага характару. Шырока вядомае яго сачыненне «Фантазія для аргана фа мінор» прызнанае лепшым узорам арганнай музыкі перыяду рамантызму.

Яшчэ ў 1854 г. Станіслаў Манюшка сумесна з кампазітарам і педагогам Ф. Міладоўскім стварылі ў Вільні таварыства св. Цыцыліі (1854 г.), мэтай якога было фарміраванне ў беларусаў высокага мастацкага густу сродкамі духоўнай музыкі. Дзеля гэтага стваральнікі таварыства ладзілі ў сезон па некалькі канцэртаў, а С. Манюшка спецыяльна падрыхтаваў уласны зборнік літургічных спеваў «Песні нашага касцёла» [5, с. 69]. Дарэчы, пэўны час ён служыў арганістам і дырыжорам у адным з віленскіх касцёлаў.

На працягу ўсяго жыцця Станіслаў Манюшка падтрымліваў і прафесійна, і фінансава беларускіх музыкантаў-пачаткоўцаў. Выдаўцам ён дасылаў лісты-рэкамендацыі з просьбамі выдаць творы таго ці іншага беларускага кампазітара. Так, Ф. Лісту ён рэкамендаваў творы Ф. Міладоўскага, мінскага фартэпіяннага і арганнага майстра І. Бяляўскага, гродзенскай скрыпачкі Т. Юзафовіч і інш. Як педагог С. Манюшка працаваў з шэрагам будучых славутых выканаўцаў-землякоў. Сярод іх – піяністкі І. Горват, К. Марцінкевіч, скрыпачка Б. Крыгер.

Шматгранная творчая, педагагічная і грамадская дзейнасць Станіслава Манюшкі цесна звязана з багатай самабытнай культурай беларускага народа. У большасці з яго музычных твораў знайшлі ўвасабленне прынцыпы сентыменталізму і рамантызму. Але разам з тым музычная спадчына славутага кампазітара носіць і адбітак новага для таго часу музычнага напрамку – фальклярызму. Менавіта ён стаў падмуркам беларускай нацыянальнай музычнай культуры і прафесійнага опернага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


1. **Антоневич, В. А.** О национальном самоопределении композиторской культуры Беларуси / В. А. Антоневич // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2001. – № 1. – С. 13–18.
2. **Дадзіёмава, В. У.** Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя / В. У. Дадзіёмава. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2012. – 230 с.
3. **Мархель, У.** Прысутнасць былога – пераадоленне стэрэатыпаў / У. Мархель // Романтизм в музыке: материалы науч.-практ. конф., Минск, 3–5 декабря 1997 г. / сост. Т. А. Титова. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 1999. – С. 11–24.
4. **Скарабагатаў, В.** Зайгралі спадчынныя куранты / В. Скарабагатаў. – Мінск: Тэхналогія, 1998. – 154 с.
5. **Смолик, А. И.** Художественная культура Беларуси: между Западом и Востоком / А. И. Смолик, М. М. Соколовская. –Beau Bassin. Mauritus : Lambert Academic Publishing, 2019. – 193 с.
6. **Федорук, А. Т.** Старинные усадьбы Минского края / А. Т. Федорук. – Минск: Полифакт, 2000. – 416 с.
7. **Шасцілоўская, К.** Камерна-вакальная творчасць Станіслава Манюшкі / К. Шасцілоўская // Беларускае музыказнаўства: матэрыялы IX навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай. – Мінск: Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, 2001. – С. 91–96.
8. **Rudzinski, W.** Stanislaw Moniuszko. Studia I materialy / W. Rudzinski. – Krakow: PWM, 1955. – Czesc I. – 476 s.
9. **Syrokomla, W.** Korespondecja / W. Syrokomla // Gazeta Warszawska. – 1855. – 4 (16) lipca.